— Выразна прачытайце назву верша. Які сказ вы толькі што прачыталі? *(Сказ-пытанне.)* Паспрабуйце даць адказ на гэта пытанне. (Выслухоўваюцца розныя меркаванні вучняў.)

— Паслухайце верш і скажыце, які адказ на гэтае пытанне дае аўтар верша. (Настаўнік чытае верш.) Якія бываюць словы па меркаванні аўтара? *(Родныя, мудрыя, смачныя, цікавыя, ветлівыя.)*

Арганізуецца гутарка па пытаннях і выбарачнае чытанне:

— Знайдзіце і прачытайце ў вершы родныя (мудрыя і г. д.) словы. Чаму аўтар лічыць гэтыя словы роднымі (мудрымі і г. д.)? А якія яшчэ словы вы назвалі б роднымі (мудрымі і г. д.)?

Адпрацоўка выразнага чытання верша (першы — чацвёрты радкі — з пачуццём любові, астатнія — з пачуццём радасці).

— Прачытайце пытанні Кірыліцы. Як бы вы адказалі на іх? Падумайце! (Прыгадваюцца словы ветлівасці, словы суцяшэння, словы з памяншальна-ласкальным адценнем.)

На ўроках навучання пісьму будуць выкарыстоўвацца дапрацаваныя вучэбныя дапаможнікі **«Пропісь 1»**, **«Пропісь 2»**, **«Пісьмо»**. У названых вучэбных выданнях скарэкціраваны арыенціровачныя знакі, якія дапамагаюць выпрацоўваць навык пісьма: графічныя выдзяленні пачатку і напрамку пісьма; прыпынак для адпачынку і самакантролю. Перагледжаны і ўдасканалены змест некаторых заданняў. Павялічана колькасць слоў і сказаў для спісвання з друкаванага ўзору. Для арганізацыі самастойнай дзейнасці вучняў дадаткова прапанавана яшчэ адна старонка. Абноўлены асобныя ілюстрацыі і заданні.

***Свірыдзенка В. І.**, дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, кандыдат педагагічных навук, дацэнт*

# Беларуская мова. IV клас. Змены ў змесце вучэбнага дапаможніка для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання

У 2024/2025 навучальным годзе ў IV класе ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання, выкладанне беларускай мовы будзе арганізавана з выкарыстаннем наступнага вучэбнага дапаможніка:

Свірыдзенка, В. І. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 4-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі, з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / В. І. Свірыдзенка. — 2-е выд., перагледж. і дап. — Мінск : Акадэмія адукацыі, 2024.

Дапаможнік дапрацаваны па выніках вопытнай праверкі, праведзенай у 2018/2019 навучальным годзе, а таксама па прапановах настаўнікаў — удзельнікаў дыялогавай пляцоўкі «Якасць вучэбных дапаможнікаў па вучэбных прадметах для І ступені агульнай сярэдняй адукацыі», якая адбылася 6 ліпеня 2022 г. у Акадэміі паслядыпломнай адукацыі.




У змест вучэбнага дапаможніка ўнесены шэраг змен.

1. Зменены пералік умоўных абазначэнняў з мэтай рэалізацыі адзіных патрабаванняў да структуры і навігацыйнага апарату ў вучэбных выданнях для І ступені агульнай сярэдняй адукацыі (мал. 1).

**Умоўныя абазначэнні:**

[?!] — праблемнае пытанне;

[Рм] — заданне па развіцці маўлення;

[A] — слоўнік;

[⌂] — дамашняе заданне;

❖ — заданне, якое выконваецца па жаданні.

Малюнак 1

**116.** Вусна складзіце па падказках алгарытм вызначэння асновы ў слове *добры*.

1. Змяняем ... .
*Добры — добрыя, добрага, добраму, добрым.*

2. Знаходзім і выдзяляем у слове □.
*Добр[ы].*

3. Частка слова без □ — гэта ... .
*Добры.*

Малюнак 2

◆◆◆

**75.** Прачытайце сказы з адпаведнай інтанацыяй. Назавіце ў іх аднародныя члены.

1. Людзі гулялі па плошчы, па парку. Людзі гулялі па плошчы **і** па парку.
2. Федзя не пакінуў сябра ў бядзе, дапамог яму. Федзя не пакінуў сябра ў бядзе, **а** дапамог яму.
3. Таня глядзела на дрэва, не заўважала гняздзечка. Таня глядзела на дрэва, **але** не заўважала гняздзечка.

Назавіце словы, якімі адрозніваюцца сказы кожнай пары.
[?!] Што злучаюць гэтыя словы ў сказах? Запішыце сказы са словамі ***і, а, але***.

Аднародныя члены сказа звязваюцца паміж сабой інтанацыяй пералічэння і словамі ***і, а, але***. Словы ***і, а, але*** — гэта **злучнікі**.

Малюнак 3

2. У практыкаваннях, накіраваных на складанне навучэнцамі алгарытмаў, выкарыстана колеравае выдзяленне крокаў алгарытму (мал. 2).

3. Выкарыстана графічнае абазначэнне пачатку ўрока для візуальнага раздзялення дыдактычнага матэрыялу розных урокаў (мал. 3).

4. Скарэкціраваны аб'ём дамашніх практыкаванняў. Яны дапоўнены заданнямі, што выконваюцца вучнямі па жаданні (мал. 4).

5. Пераразмеркаваны слоўнікавыя словы па дзвюх частках вучэбнага дапаможніка. У першую частку дапаможніка ўключаны слоўнікавыя словы *вуліца, меншы*. Гэта дазволіць забяспечыць патрэбным моўным матэрыялам змест кантрольных слоўнікавых дыктантаў у першым паўгоддзі.

[⌂] **63.** Прачытайце верш. Чаму здзівіўся баравік?

**Баравік**

Па р*(а/о)*се без чаравік
выбе*(г/х)* з бору б*(а/о)*равік.
Бачыць сонца...
Дзіўна трошкі:
як яно расце без но*(ж/ш)*кі?!

*Д. Бічэль.*



Спішыце, раскрываючы дужкі.
Вусна вызначце сувязь слоў у першым сказе. Падкрэсліце ў ім дзейнік і выказнік.
❖ Абазначце корань у аднакаранёвых словах.

Малюнак 4

Назоўнікі 1-га скланення ў давальным і месным склонах маюць аднолькавыя канчаткі *-е, -і, -ы, -э*.

| Назоўнікі з асновай | | Канчаткі |
|---|---|---|
| на ***цвёрды*** зычны і на ***г, х*** | | *-е (лямп[е], страс[е], наз[е])* |
| на ***мяккі*** зычны | | *-і (песн[і])* |
| на ***зацвярдзелы*** зычны | | *-ы (нар[ы])* |
| на ***к*** | пад націскам | *-э (рац[э])* |
| | не пад націскам | *-ы (місц[ы])* |

Апошнія зычныя асновы могуць **чаргавацца**: ***г → з, х → с, к → ц***.

Малюнак 5

6. Павялічана колькасць слоў, значэнне якіх тлумачыцца на старонках вучэбнага дапаможніка ў рубрыцы «Слоўнік».

7. Моўны матэрыял пра правапіс канчаткаў назоўнікаў па магчымасці пададзены ў таблічнай форме (мал. 5).

8. Зменена падача матэрыялу ў рубрыцы «Праверце сябе», прызначанай для арганізацыі кагнітыўнай рэфлексіі пасля вывучэння кожнага раздзела вучэбнага дапаможніка. У рубрыку ўключаны два блокі: «Адкажыце на пытанні» і «Творчая хвілінка». Першы блок утрымлівае пералік пытанняў, якія дапамогуць вучням узнавіць веды, атрыманыя пры вывучэнні раздзела. Другі блок утрымлівае дадатковыя творчыя заданні, выкананне якіх патрабуе прымянення ведаў, уменняў і навыкаў, набытых у ходзе вывучэння раздзела. Напрыклад, пасля вывучэння раздзела «Тэкст» вучням неабходна спачатку адказаць на пытанні: *З дапамогай чаго звязваюцца сказы ў тэксце? Якія тыпы тэкстаў вы ведаеце? Чым адрозніваюцца тэкст-апавяданне, тэкст-апісанне і тэкст-разважанне? Як скласці тэкст-апавяданне? Як скласці тэкст-апісанне? Як скласці тэкст-разважанне*? У далейшым чацвёртакласнікам прапануецца выканаць наступныя заданні:

• Уявіце, што вам неабходна скласці тэксты розных тыпаў пра нашу краіну. Прачытайце прапанаваныя загалоўкі.

*Ганаруся Беларуссю.*
*Зямля з блакітнымі вачамі.*
*Цікавая вандроўка па родным краі.*

• Да якога тыпу тэксту падыходзіць кожны з гэтых загалоўкаў?

• Складзіце адзін тэкст на выбар.

• Паспрабуйце скласці некалькі тэкстаў розных тыпаў.

9. З мэтай павышэння выхаваўчага патэнцыялу вучэбнага дапаможніка ў дыдактычны матэрыял некаторых урокаў уключаны дадатковыя заданні (мал. 6).

10. Змены ў змесце вучэбнага дапаможніка знайшлі адлюстраванне ў каляндарна-тэматычным планаванні па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» (2024/2025 навучальны год).

> **Рм** На якім заводзе ў Беларусі вырабляюць надзейныя і прыгожыя гадзіннікі?
> По чым яшчэ можна вызначыць час?
>
> ***Творчая хвілінка***
>
> На гербе якога беларускага горада адлюстраваны лебедзь? Чаму? Апішыце словамі гэты герб. Пры неабходнасці знайдзіце патрэбныя звесткі ў інтэрнэце.
>
> ❖ Паслядоўна пералічыце месяцы года. Якія важныя святы мы адзначаем у кожным з іх?
>
> Падумайце, уладаром якой пары года з'яўляецца міфалагічны персанаж Жыцень? За што яго шанавалі нашы продкі?

*Малюнак 6*

***Антонава Н. У.**, дактарант Акадэміі адукацыі, кандыдат педагагічных навук, дацэнт;*
***Галяш Г. А.**, настаўнік вышэйшай катэгорыі беларускай мовы і літаратуры ліцэя Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта*

# Беларуская мова. I клас

## (установы адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання)

### *Урокі 6–10*

*Працяг. Пачатак гл. № 6 за 2024 г.*

#### Урок 6. Я і мая сям'я. Мае сваякі

**Мэта ўрока:** фарміраваць навык правільнага вымаўлення гука [дж], пазнаёміць з лексікай на тэму «Мае сваякі», пазнаёміць са значэннем выразу «дзіравая памяць»; фарміраваць уменні аўдзіравання (прагназаваць змест тэксту па малюнках, суадносіць пачутае з малюнкавым радам, адказваць на пытанні па змесце твора, вызначаць у тэксце новыя словы лексічнай тэмы); фарміраваць уменні гаварэння (паўтараць за настаўнікам сказы, арыентуючыся на схемы, выказвацца па малюнках да твора, будаваць маналагічнае выказванне пра сваю сям'ю); развіваць фанематычны слых, слыхавую памяць; выхоўваць паважлівыя адносіны да сваякоў, да старэйшых.

**Абсталяванне:** малюнкі з дэманстрацыйнага матэрыялу: «Сям'я на дачы», мама з татам, бабуля з дзядулем, чаравікі, прас, шкарпэткі.

**I. Актуалізацыя ведаў і ўменняў вучняў.**

Узнаўленне і замацаванне навыку вымаўлення спалучэння гукаў [шч]. Праца з чыстагаворкай:

Шча-шча-шча — злавілі мы ля... (*шча*),
шчу-шчу-шчу — я яго пачы... (*шчу*).

Настаўнік вымаўляе чыстагаворку па адным радку, вучні паўтараюць і дадаюць патрэбны склад. Кожны радок паўтараецца хорам і індывідуальна. Потым вучні па памяці вымаўляюць усю чыстагаворку. Вучні ацэньваюць правільнасць вымаўлення і тлумачаць адрозненні ў вымаўленні гука [ч] і спалучэння гукаў [шч] у рускай і беларускай мовах.

**II. Вывучэнне новай тэмы.**

**1. Фарміраванне навыку вымаўлення гука [дж] (заданне 1 вучэбнага дапаможніка).**

Настаўнік запрашае вучняў разгледзець малюнкі і закончыць выказванні ў адпаведнасці з малюнкамі:

Я хаджу з ... (*палкамі*).
Я гляджу ў ... (*бінокль*).
Я сяджу ў ... (*позе йога*).

Настаўнік просіць паўтарыць словы, якімі назвалі дзеянні чалавека. Вызначаецца новы для вучняў гук [дж]. Вымаўленне гука [дж] ізалявана хорам, індывідуальна, па радах.

Далей праводзіцца работа па дарэчным ужыванні слоў з гукам [дж]. Вучням трэба хорам правільна дапоўніць верш, які вымаўляе настаўнік:

У школу кожны дзень... (*хаджу*).
За партай ціха я... (*сяджу*).
На настаўніцу... (*гляджу*).

— Хто мог сказаць гэтыя словы? *(Вучань ці вучаніца.)*